Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёну»

# Выраб падвяснай цацкі “Жаўрук – птушка шчасця”

**МАЙСТАР-КЛАС**



Аўтар-складальнік:
Пратасеня Мікалай Аляксеевіч
педагог дададковай адукацыі,
кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка”

Салігорск 2023

## Анатацыя

Дадзены майстар-клас абагульняе назапашаны шматгадовы педагагічны вопыт работы педагога дадатковай адукацыі, сябра Беларускага Саюза майстроў, народнага майстра Беларусі, кіраўніка Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка” Пратасені Мікалая Аляксеевіча ў тэхніцы традыцыйнай беларускай керамікі. Майстар-клас паказвае аўтарскую методыку работы з навучэнцамі, асаблівасці вывучэння тэарэтычных ведаў і прымянення практычных уменняў і навыкаў, а таксама спосабы прымянення тэхнікі ў сучасным жыцці. Прызначаны для педагогаў дадатковай адукацыі і выкладчыкаў выяўленчага мастацтва.

## Змест


Тлумачальная запіска........................................................................................ 4
Тэхналагічная карта майстар-класа.................................................................. 5
Ход майстар-класа............................................................................................ 6
Мэтавая ўстаноўка. .......................................................................................... 6
Знаёмства з тэмай і мэтай майстар-класа. ...................................................... 6
Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці................................................................ 7
1. *Выхаваўчая роля цацкі.*.............................................................................. 7
2. *Гісторыя ўзнікнення керамічнай цацкі.* ...................................................... 7
3. *Вопыт работы студыі "Скарбонка".* .......................................................... 7
4. *Гліняная птушка ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі.*..... 8
5. *Метадычныя рэкамендацыі для работы з навучэнцамі пры вырабе падвяснoй птушкі.*.................................................................................................. 8
Практычная частка.......................................................................................... 9
1. *Прадстаўленне матэрыялаў для работы.* ................................................... 9
2. *Паслядоўнасць выканання падвяснoй цацкі "Жаўрук – птушка шчасця*
Майстар-клас "Жаўрук – птушка шчасця" ....................................................... 9
Заключная частка ........................................................................................... 10
1. *Традыцыйная гліняная птушка – у сучасным жыцці.* .............................. 10
2. *Падвядзенне вынікаў*................................................................................. 10
Рэфлексія. Жаваронaчкі нашага настрою ........................................................ 11
Спіс выкарыстанай літаратуры ....................................................................... 12
*Дадатак 1* Падвясныя птушкі з розных матэрыялаў ...................................... 13
*Дадатак 2* Паслядоўнасць вырабу гліняная цацкі "Птушка шчасця"............ 14
*Дадатак 3* Праект "Жаваронaчкі прыляціце, нам шчасцейка прынясіце"..... 15
*Дадатак 4* Майстар-клас "Жаўрук – птушка шчасця" .................................... 16

## Тлумачальная запіска

**Актуальнасць:** Майстар-клас уяўляе сабой аўтарскую методыку педагога дадатковай адукацыі Пратасені Мікалая Аляксеевіча ў тэхніцы традыцыйнай беларускай керамікі. У ім адлюстраваны метады і прыёмы работы з навучэнцамі, метадычныя рэкамендацыі па вырабу падвясной цацкі, прымяненне традыцыйнай тэхнікі ў сучасным жыцці. Майстар-клас садзейнічае адраджэнню і захаванню тэхналогіі вырабу беларускай падвясной цацкі “Жаўрук – птушка шчасця” для падрастаючага пакалення, распаўсюджванню педагагічнага вопыту работы для выкарыстання ў рабоце аб'яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю.

**Праблема:** Дзякуючы аўтарскай методыцы Пратасені М.А. навучэнцы Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка” маюць высокую рэзультатыўнасць удзелу ў выставах, конкурсах і фестывалях рознага ўзроўню, вопыт работы адрозніваецца ад стандартных адукацыйных практык, адпавядае сучасным адукацыйным тэндэнцыям, прадугледжвае нестандартнае прымяненне тэхнікі ў побыце і сучасным інтэр'еры.

**Мэта:** далучэнне ўдзельнікаў майстар-класа да мастацтва беларускай керамікі праз авалоданне спосабамі і прыёмамі вырабу падвясной цацкі “Жаўрук – птушка шчасця” для работы з навучэнцамі сваіх аб’яднанняў па інтарэсах, трансляцыя вопыту работы Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка”.

**Задачы:**

*адукацыйныя:*

- пашырыць кругагляд удзельнікаў майстар-класа праз знаёмства з гісторыяй развіцця і характэрнымі асаблівасцямі беларускай народнай керамікі, з творчасцю вядомых майстроў;
- пазнаёміць з малавядомымі здабыткамі глінянай цацкі;
- навучыць тэхналогіі вырабу падвясной глінянай птушкі;
- сфарміраваць уменні творча прымяняць народныя тэхналогіі ганчарства ў сучасных умовах;

*развіваючыя:*

- стымуляваць цікавасць педагогаў дадатковай адукацыі да традыцыйнай беларускай керамікі;
- абмяняцца вопытам педагагічнай дзейнасці;
- развіваць зацікаўленасць да стварэння цацкі, маючай нацыянальную адметнасць, гісторыка-культурную значнасць і мастацкую каштоўнасць;

*выхаваўчыя:*

- садзейнічаць фарміраванню каштоўнасных адносін да народнага мастацтва, нацыянальных традыцый, імкнення да іх творчага засваення і захавання;
- зацікавіць удзельнікаў у адраджэнні і захаванні тэхналогіі вырабу беларускай падвясной цацкі “Жаўрук – птушка шчасця”.

**Час:** 2г 35 хв

**Удзельнікі:** педагогі дадатковай адукацыі і выкладчыкі выяўленчага мастацтва.

**Ключавыя словы:** дэкаратыўна-прыкладная творчасць, традыцыйная беларуская кераміка, падвясная птушка.

**Від занятку:** камбінаваны.

**Метады навучання:** апавяданне, тлумачэнне, дэманстрацыя, самастойная работа.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:**

Працоўнае месца (гліна, шлікер, стэкі, качалка, дошчачка, лінейка, дрот).

Файлавы матэрыял (схемы паслядоўнасці выканання, фотаздымкі работ беларускіх майстроў і навучэнцаў студыі).

Узоры гатовых работ навучэнцаў студыі і педагога.

**Тэхналагічная карта майстар-класа**

| **Этапы майстар-класа, час** | **Ход майстар-класа** | | |
|---|---|---|---|
| | **Дзейнасць педагога** | **Дзейнасць удзельнікаў** | **Формы і метады** |
| Падрыхтоўчы этап<br>10 хв | **Арганізацыйны момант. Мэтавая ўстаноўка.**<br>1.Знаёмства з тэмай і мэтай майстар-класа. | Прывітанне, арганізацыя рабочага месца, настрой на прадукцыйную дзейнасць. | Апавяданне<br>Прасмотр нагляднага матэрыялу |
| Тэхналагічны этап<br>2 г 10 хв | **Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці.**<br>1. Выхаваўчая роля цацкі.<br>2. Гісторыя ўзнікнення керамічнай цацкі.<br>3. Вопыт работы студыі “Скарбонка”.<br>4. Гліняная птушка ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі.<br>5. Метадычныя рэкамендацыі для работы з навучэнцамі пры вырабе падвясной птушкі.<br>**Практычная частка.**<br>1. Прадстаўленне матэрыялаў для работы.<br>2. Паслядоўнасць | Актуалізацыяп апярэдніх ведаў<br>Фарміраванне новых ведаў<br>Дыялог з педагогам<br>Фарміраванне новых уменняўі навыкаў.<br>Замацаванне | Апавяданне<br>Дэманстрацыя нагляднага матэрыялу: выстава гатовых вырабаў, узораў.<br>Тлумачэнне<br>Выкарыстанне табліцы з выявамі птушак<br>(*Дадатак 1*)<br>Арганізацыя самастойнай дзейнасці ўдзельнікаў.<br>Выкарыстанне |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | выканання падвясной цацкі “Жаўрук – птушка шчасця”. | папярэдніх уменняў і навыкаў | табліцы паслядоўнасці вырабу цацкі (*Дадатак 2)* |
| Заключны этап 15 хв | **Заключная частка.**<br>1. Традыцыйная гліняная птушка – у сучасным жыцці.<br><br>2. Падвядзенне вынікаў<br><br><br>**Рэфлексія. Жаваронbackslashкі нашага настрою** | Замацаванне пройдзеннага матэрыялу<br>Аналіз гатовых работ<br><br><br>Стварэнне кампазіцыі настрою | Дэманстрацыя готовых работ.<br>Табліца з фотаздымкамі работ навучэнцаў студыі *(Дадатак 3)*<br>і другіх педагогаў (*Дадатак 4)*<br>Рэкамендацыі па ўдасканаленню тэхнікі<br>Апісанне эмоцый ад майстар-класа |

**Ход майстар-класа**

**Арганізацыйны момант.**

Добры дзень, паважаныя калегі. Я – педагог дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёну», кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка” Пратасеня Мікалай Аляксеевіч.

Развіццё творчых здольнасцей – адна з актуальных задач адукацыі. У кожнага дзіцяці ёсць свае здольнасці і таленты, таму задачай педагога з'яўляецца сістэматычнае мэтанакіраванае развіццё ў дзяцей рухомасці і гнуткасці мыслення, уяўлення, інтуіцыі, здольнасці рызыкаваць і выказваць арыгінальныя ідэі. Адным са спосабаў развіцця творчых здольнасцей дзіцяці з’яўляецца дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Для самарэалізацыі і гарманічнага развіцця асобы навучэнцаў, яны павінны авалодаць ведамі, уменнямі і навыкамі ў розных напрамках выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, каб у далейшым выбраць для сябе і паглыблена займацца тэхнікай, якая больш падабаецца. Для кагосьці такім напрамкам стане беларуская народная кераміка.

**Мэтавая ўстаноўка.**

**Знаёмства з тэмай і мэтай майстар-класа.**

Тэма майстар-класа “Выраб падвясной цацкі “Жаўрук – птушка шчасця”. Я пазнаёмлю вас са шматгадовым вопытам работы Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка”. Сёння вы даведаецеся аб гісторыі ўзнікнення беларускай цацкі, яе разнавіднасцях, тэндэнцыях развіцця сучаснай цацкі на Салігоршчыне, і навучыцеся ствараць падвясную цацку, каб у будучым перадаць гэтыя веды сваім навучэнцам.

**Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці.**

1. ***Выхаваўчая роля цацкі.***

Цацка – гэта вялікі казачны цуд у нашым жыцці, частка нашай вялікай культуры, гэта першая і самая лепшая азбука дзяцінства. Толькі ў цаццы знайшлося гарманічнае спалучэнне такіх функцый, як дзіцячая забаўка і скарбніца жыццёвага вопыту, гэта нацыянальны мастацкі твор з вялікім духоўным і практычным патэнцыялам, які можа развіваць, з якім можна весці дзіця ў дарослае жыццё. Гліняная цацка, як і цацкі з другіх матэрыялаў, з'яўляецца сапраўдным рукатворным цудам у жыцці многіх народаў. Цаццы нададзена забаўляць дзіця, развіваць яго жыццёвы вопыт, уяўленне, фантазію, усё тое, што неабходна ў далейшым жыцці.

2. ***Гісторыя ўзнікнення керамічнай цацкі.***

Вытокі глінянай цацкі зыходзяць з часоў неаліта 2-4 тысяч гадоў да нашай эры. Вучоныя знаходзяць іх у час раскопак курганоў, паселішчаў старажытнага чалавека. Першымі цацкамі былі бразготкі і свістулькі. Гэтыя цацкі выкарыстоўваліся нашымі продкамі не толькі як дзіцячыя забаўкі, але і як абярэгі, ахоўвалі ад "нячыстай сілы". Нашы продкі верылі, што свіст цацкі і гук бразготкі адганялі злых духаў, вар'ятаў, аберагалі ад іх дзяцей.

Сёння цацкі, вылепленыя нашымі майстрамі, маюць падабенства з цацкамі старажытнага чалавека. Яны невялікага памеру, простыя па форме, маюць тыя ж сюжэтныя вобразы. Стылістыка гэтых цацак пазбаўлена лішніх падрабязнасцяў. Перадаецца толькі самае важнае, характэрнае гэтаму вобразу. Цацкі выконваюцца хутка, з невялікімі затратамі часу, у іх танны кошт. Такая абагульняючая стылістыка цацкі стымулюе дзіцячую фантазію, развівае вобразнае мысленне. Сёння многія майстры працягваюць ствараць яе на выснове прадаўжэння традыцыйнай стылістыкі цацак якога-небудзь вядомага майстра, які працаваў раней, працягваючы і развіваючы гэтыя традыцыі.

3. ***Вопыт работы студыі "Скарбонка".***

У дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна» шмат гадоў працуе Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Скарбонка» пад маім кіраўніцтвам. Студыя "Скарбонка" – вядомы ў рэспубліцы калектыў. Сістэма навучання ў студыі дазваляе даць навучэнцам не толькі веды і навыкі па асноўных відах ганчарнага рамяства, але і развіваць індывідуальныя задаткі, мастацкае мысленне, творчы талент; падрыхтавацца і выбраць будучую прафесію. Навучанне вядзецца па аўтарскай праграме "Мастацтва народнай керамікі", зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Народнае мастацтва, яго вывучэнне, адраджэнне і зберажэнне – асноўны напрамак дзейнасці студыі. Ганчарнае мастацтва Міншчыны, рамяство майстроў свайго горада і суседніх цэнтраў вывучаецца і працягваецца ў яе творчай дзейнасці.

У Салігорску з'явілася свая цацка, яна адпавядае лепшым канонам традыцыйнасці – мае цэльнасць канструкцыі, формы, традыцыйнасць сюжэту, стрыманасць дэкаратыўнай аздобы, але адрозніваецца адметнымі стылістычнымі рысамі, сваёй вобразнай індывідуальнасцю. Ствараюць яе як педагогі студыі, так і лепшыя навучэнцы і выпускнікі, майстры-педагогі, якія навучаюць дзяцей.

4. ***Гліняная птушка ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі.***

Асаблівай любоўю ў нашага народа ў фальклорнай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці карысталіся птушкі. Людзі лічылі, паводле павер'яў, што птушкі, якія вярталіся з выраю, прыносілі ключы і адмыкалі зямлю ад доўгай спячкі. Кожная пеўчая птушка была сімвалам дабра, радасці, шчасця.

Вялікімі мастацкімі вартасцямі валодалі выявы падвясных птушак, якія падвешвалі на нітачцы над калыскай альбо пад столлю на покуці. Гэтыя цацкі-птушкі рабілі з саломкі, дрэва, бумагі і нават з гліны. [7]. Выраб драўляных птушак адрадзіў на Беларусі майстар Міхась Ржавуцкі. Цяпер іх вырабляюць і іншыя ўмельцы, майстры, якія працуюць з дрэвам (дадатак 1, мал. 1). Саламяныя птушкі таксама вылятаюць з цудоўных рук нашых беларускіх майстроў-саломшчыкаў. (дадатак 1, мал. 2). А вось гліняныя падвясныя птушкі амаль не "лятаюць". Гэты напрамак народнага рамяства зусім забыты.

Папулярным у тыя часы было і печыва з цеста пернікаў у выглядзе птушак-жаўрукоў да вясновых святаў. Разнастайныя па форме і пластыцы "жаваронкі" і "кулікі" выпякалі да веснавых святаў і абрадаў. Фігуркі з цеста выконвалі магічную функцыю – сімвалізавалі прыход вясны, віталі прылёт птушак. Дзеці бегалі па вёсцы, падкідвалі ўгору птушкі-ласункі і спявалі песні-вяснянкі "Жавароначкі прыляціце, вясну красную прынясіце!" [7]. Іх пяклі у кожнай вёсцы і ў кожнай хаце, дзе раслі дзеці (дадатак 1, мал. 6).

У экспазіцыі Музея маці Цэнтра творчасці над дзіцячай калыскаю і сялянскаю каляскаю з доўгім дышлем, якія яшчэ бытавалі да сярэдзіны мінулага стагоддзя, гойдаюцца традыцыйныя народныя птушкі з розных матэрыялаў (дадатак 1, мал. 7, 8), якія падвешвалі ў мінулым у сялянскіх хатах і многіх гарадскіх кватэрах.

5. ***Метадычныя рэкамендацыі для работы з навучэнцамі пры вырабе падвясной птушкі.***

Выраб цацкі патрабуе засваення многіх тэхналагічных прыёмаў, уменняў, навыкаў стварэння керамічныя формаў, без якіх нельга спасцігнуць мастацтва керамікі. Толькі пазнаўшы тэхналогію, можна ствараць, увасабляць свае творчыя здольнасці, талент у творы мастацтва. Вывучэнне народнага мастацтва, той жа цацкі, ні ў якім разе не абмяжоўвае творчае развіццё асобы, а дае спасылкі больш шматгранна развіваць свае здольнасці, фарміраваць цэльнасць свайго мастацкага погляду, уменне выражаць свой духоўны патэнцыял у матэрыяльным творы.

Вучыцца рабіць цацку трэба на лепшых узорах майстроў прошлага і сучаснага часу, тых творах, якія знаходзяцца ў музеях, экспазіцыях

выставачных залаў, ствараюцца майстрамі-пераможцамі конкурсаў і фестываляў, чыя творчасць з’яўляецца вялікім культурным здабыткам.

Абагуленасць формы, выразнасць сілуэта, мінімальная пластычная трактоўка вобраза без непатрэбных дэталяў, манументальная цэльнасць канструкцыі без лішкаў каляровага аздаблення і, у той жа час, цеплыня і непасрэднасць у падачы вобраза – такая яна, народная цацка.

Пры навучанні дзяцей, зручна выкарыстоўваць картонныя шаблоны, выразаючы дэталі птушкі. У працэсе вырабу цацкі, трэба засяродзіць увагу на тым, каб абавязкова правільна выканаць праколы для наступнай зборкі ўсіх дэталяў. У час афарбоўкі неабходна растлумачыць асаблівасці традыцыйнага беларускага роспісу гліняных цацак.

**Практычная частка.**

1. ***Прадстаўленне матэрыялаў для работы.***

Для работы нам спатрэбяцца наступныя інструменты і матэрыялы: стэкі, дошчачка, губкі, гліна, шлікер, ангобы, паліва, дрот. У дапамогу вам – карта паслядоўнасці вырабу падвяснай птушкі (дадатак 1).

2. ***Паслядоўнасць выканання падвяснай цацкі “Жаўрук – птушка шчасця”.***

1. Птушка (мал. 1) зроблена з наступных паасобных частак: тулава з хвастом і двух крылаў змацаваных пры дапамозе дроту і клею.
2. Раскатваем кавалак гліны качалкаю ў блін (мал. 2).
3. На гэтым пласце адвольна стэкам акрэсліваем контурны малюнак з абрысамі, падобнымі на рыбку і вырэзваем стэкам па контуру (мал. 3).
4. Выразанай загатоўцы надаем, згортваючы і расплюшчваючы ўсяродку, форму будучага тулава птушкі (мал. 4).
5. Стыковачныя краі змазваем шлікерам, згортваем і заглажваем стыкі, удакладняючы абрысы выявы (мал. 5).
6. Канчаткова фармуем тулава і хвост нашай выяве, зглажваем паверхню вырабу (мал. 6).
7. Паўкруглым стэкам адціскаем галоўку з дзюбай. Памячаем вочкі, робім стэкам упадзіны, шлікерам прыклейваем невялікія вочкі-шарыкі (мал. 7).
8. Каб зрабіць крылы, раскатваем кусочкі гліны ў пласт, надаем ім сегментную форму, альбо другі абрыс, падобны на крылы і вырэзваем стэкам. Вугал аднаго з сегментаў мае большую таўшчыню. Процілегламу боку надаем паўкруглую форму. Такіх дэталяў выконваем дзве. Пасля гэтага паўкруглым стэкам на крылах і хвасце прымінаем канаўкі ў радыяльным напрамку, якія імітуюць напрамак пер’яў. Тарцы гэтых жа дэталяў таксама праціскаем стэкам (мал. 8).
9. Каб усе дэталі злучыць у адну выяву, у крылах вострым краем стэка робім паглыбленні на 1-2 см. У тулаве птушкі, пасяродку, збоку таксама робім пракол – для крылаў, а зверху – для кранштэйна-падвескі (мал. 9).
10. Калі дэталі падсохнуць, можна зрабіць ангобны роспіс 2-3 колерамі ў залежнасці ад задумкі. Карычневым ангобам пафарбаваць верхнюю частку галавы і дзюбы птушкі, ніжнюю частку дзюбы і галоўкі – у жоўты

або белы колер. Па краю крылаў і хваста правесці палоскі карычневага і жоўтага колеру. Зафарбоўваць, пакрываць ангобам усе дэталі выявы непажадана (мал. 10). Пасля ангобнага роспісу, дэталі нашай выявы патрэбна абпаліць у муфелі. Выразна і дэкаратыўна будзе выглядаць наш выраб у спалучэнні частковага роспісу, пакрытага бескаляровай палівай, і матавай тэракотавай паверхні. Потым тыя паверхні, якія распісаны ангобам, пажадана пакрыць бескаляровай палівай і зноў абпаліць пры тэмпературы плаўлення палівы.

11. Гатовыя часткі вырабу пры дапамозе дроту і клею збіраем у адно цэлае. У верхняй частцы прымацоўваем кранштэйн-падвеску, зробленую з такога ж дроту (мал. 11). Калі клей высахне, працягваем вяровачку і падвешваем нашу птушку шчасця "Жаўрук".

**Заключная частка.**

1. ***Традыцыйная гліняная птушка – у сучасным жыцці.***

Тыя культурныя здабыткі, якія шліфаваліся вякамі чалавечай мудрасцю і талентам, і дайшлі да нас, не павінны знікнуць у сучасным працэсе глабалізацыі. Яны павінны працягваць сваё культурна-генетычнае ўздзеянне на нашае жыццё, напаўняць нашыя душы цяплом, талентам, усім лепшым, што змог стварыць чалавек за тысячы і тысячы гадоў свайго жыцця.

І тая маленькая цацка, з якой гулялі дзеці ў далёкія старажытныя часы, і якая дашла да нас і дала жыццё цяперашнім цацкам з сучасных матэрыялаў, мае права на свае існаванне, на тое, каб яе стваралі дарослыя і дзеці.

Вось гэтыя, забытыя ў сучасны час цацкі, якія мы адраджаем цяпер у студыі "Скарбонка", калектыў навучэнцаў сабраў у творчую кампазіцыю "Жавароначкі, прыляціце, нам шчасцейка прынясіце", якая можа ўпрыгожыць інтэр'ер, асабліва ў час каляндарных веснавых святаў (дадатак 3). Наша гліняная птушка ляціць з мінулага ў сённяшні час, напаўняючы нашы сэрцы і душы святлом народнай творчасці, марай аб шчаслівым жыцці.

2. ***Падвядзенне вынікаў.***

Цяперашні час нараджае новыя ідэі, якія патрабуюць і новых формаў выканання. Але вельмі важна, каб сучасныя творы ўвабралі ў сябе лепшыя мастацкія якасці твораў мінулых пакаленняў, захавалі сваю самабытнасць, нацыянальную адметнасць. Пластычная мова цацкі, яе мастацкі вобраз – гэта час, пражыты нашым народам, гэта дыялог рук і душы, які ідзе ад пакалення да пакалення. Таму цацкі сучасных майстроў абавязкова павінны несці на сабе адбітак часу.

Сёння мы з вамі навучыліся тэхналогіі стварэння традыцыйнай беларускай падвясной цацкі "Жаўрук – птушка шчасця". Падобныя майстар-класы рэгулярна праводзяцца ў Цэнтры творчасці (дадатак 4). Далучэнне навучэнцаў да вытокаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці спрыяе адраджэнню малавядомых і забытых відаў глінянай цацкі, развіццю зацікаўленасці да стварэння цацкі, маючай нацыянальную адметнасць, гісторыка-культурную значнасць і мастацкую каштоўнасць.

**Рэфлексія. Жавароначкі нашага настрою**

А зараз мы з вамі даведаемся, з якім настроем вы сёння пакінеце ўтульны кабінет нашай студыі. Перад вамі ў кошыку – птушкі-жаўрукі рознага колеру. Калі майстар-клас вам вельмі спадабаўся – вы падвешваеце да драўлянай крыжавіны птушку чырвонага колеру, калі ў вас радасны сонечны настрой – падвешваеце птушку жоўтага колеру, калі вы поўныя жадання падзяліцца атрыманымі ведамі са сваімі навучэнцамі – падвешваеце птушку зялёнага колеру. Калі ваш настрой спалучае ўсе гэтыя ўласцівасці, можаце падвешваць некалькі птушак.

Дзякуй за ўдзел у майстар-класе!

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Алексеев, Л.В.Полоцкая земля в IX–XIII вв. (Очерки истории Северной Белоруссии)/ Л.В.Алексеев. − М.: Наука, 1966 – 159 с.
2. Касцюкевіч С.У. Цацкі-прылады для гульні ў беларусаў/ С.У.Касцюкевіч. Веснік ПГУ, № 7. Серыя А. Гуманітарныя навукі, 2005–72с.
3. Пратасеня, М.А. Гліняная казка/М.А.Пратасеня. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. – 72 с: іл. – (Энцыклапедыя народнага майстра).
4. Ржавуцкі М.С. Беларуская гліняная цацка/ М.С. Ржавуцкі. – Мн.,1991– 89с.
5. Рыбаков, Б.А. Язычество древней Руси/Б.А.Рыбаков. – М.: Наука, 1987 – 668-670с.
6. Салтыков А.Б. Самое близкое искусство/А.Б. Салтыков.–М.: Просвещение, 1969 – 296 с.
7. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва/Я.М.Сахута. –Мн.: Беларуская энцыклапедыя,2015. – 134 с.

*Дадатак 1*

## Падвясныя птушкі з розных матэрыялаў



*Дадатак 2*

Паслядоўнасць вырабу глінянай цацкі «птушка шчасця».



***Дадатак 3***

Праект «Жавароначкі прыляціце, нам шчасцейка прынясіце»













*Дадатак 4*

## Майстар-клас «Жаўрук - птушка шчасця»

